© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)
Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“),
(13 b) München 19, Schliessfach 69.
Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a.
Цана паза Нямеччынай: ЗША — 20 цэнтаў, Канада — 20 ц., Антельшчына — 1 шылінг, Францыя — 20 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Аргентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна.
Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“,
Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER “THE FATHERLAND„

№ 15 (297) Нядзеля, 8 красавіка 1956 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 10

Яшчэ аб крэмлёўскіх сэнсацыях

«Тайная» мова Хрушчова супраць Сталіна, сказаная на закрытай сэсіі XX зьезду камуністычнай партыі Савецкага Саюзу, яшчэ й сяньня ня перастае быць прадметам розных, часта супярэчных камэнтараў і здагадак у вольным сьвеце. Прызнаёмся, што ня перастае яна быць некаторай загадкай і для нас. Бо як сама форма абвінавачаньня Сталіна, як ворага народу нумар першы, гэтак і вонкавыя абставіны, пры якіх гэтае абвінавачаньне адбылося, былі чымсьці неспадзяваным і загадкавым. Справа ў тым, што хадзіла тут не аб другарадных фігурах крэмлёўскага алімпу, як трацкістыя, бухарынцы або бэрыйцы, але аб «наймудрэйшага правадыра й вучыцеля», з чыім іменем яшчэ ня так даўно было зьвязанае дасьлоўна ўсё ў Савецкім Саюзе, катораму пяяліся пахвальныя гымны, як яшчэ нікому із сьмяротных, катораму прыпісваліся дасьлоўна ўсе заслугі як у Савецкім Саюзе, гэтак і для справы міжнароднага камунізму.

Сяньня цяжка яшчэ адказаць на пытаньне, які абарот прыймуць справы ў Савецкім Саюзе ў найбліжэйшай будучыні, як і на пытаньне, што было фактычна прычынай, што нядаўны «наймудрэйшы правадыр і вучыцель» быў ягоным верным вучнем і найбліжэйшым супрацоўнікам названы публічна чалавекам ненармальным, інтэлектуальна абмежаваным і праступнікам. Да заданьняў публіцыстыкі належыць ня толькі інфармаваньне аб бягучых падзеях і камэнтаваньне іх, але таксама выцягваньне зь іх вывадаў і прадбачваньне іхнага далейшага ходу. У сувязі з гэтым папрабуем і мы разгадаць сэнс і мэты выступленьня Хрушчова.

Слова «тайная» ў дачыненьні да мовы Хрушчова мы ўзялі ў чужаслоў, бо няма найменшага сумлеву, што навет самому Хрушчову хадзіла пра тое, каб гэтая тайнасьць хутка сталася яўнасьцю. Добра ведаем з дасюлешняй крэмлёўскай практыкі, што калі там нешта мусіць быць тайнае, дык яно тайным і астаецца, прынамся на даўжэйшы час. А ў дадзеным прыпадку «тайная» мова была сказаная 25 лютага, а ўжо за два тыдні савецкая цэнзура прапускае аб ёй інфармацыі прадстаўнікоў заходніх прэсавых агенцтваў у Маскве, а заходняя прэса падае дакладны ейны зьмест. У самым-жа Савецкім Саюзе тэкст мовы апублікаваны дагэтуль ня быў, але яна таксама хутка сталася ведамай, яе зачытывалі й камэнтавалі агітатары на работніцкіх мітынгах.

Значыцца, гэтая мова была прызначаная не для нутранага ўжытку партыі, але для шырокіх масаў як унутры Савецкага Саюзу, гэтак і на Захадзе. З гэтым вяжыцца другая акалічнасьць. Чаму Хрушчоў ня выліў усіх сваіх абвінавачаньняў пад адрасам Сталіна адным замахам падчас сваей першай прамовы на зьезьдзе, а абмежаваўся толькі агульнымі намёкамі, каб усю вайстрыню абвінавачаньняў высунуць пазьней у прамове «тайнай»? Усё гэта паказвае, што справа была ўплянаваная так, каб весткі аб здэградаваньні «наймудрэйшага правадыра» да ролі ворага народу нумар першы выходзілі навонкі не адразу, але паступова. Відаць, «калектыўнае кіраўніцтва» баялася, каб раптоўныя рэвэляцыі аб Сталіне ня выклікалі вельмі сільнага ўражаньня і не зрабілі непажаданага шоку.

Цяпер другая здагадка, якую разгадаць ужо цяжэй. Яшчэ перад партыйным зьездам было ведама, што Сталін і сталінізм, як палітычная сыстэма, абапёртая на кульце адзінкі, была «калектыўным кіраўніцтвам» адкінутая. У прамовах Хрушчова, Маленкава і асабліва Мікаяна на зьезьдзе сталінізм быў афіцыяльна засуджаны і абвінавачаны ў цэлым радзе памылак і няўдачаў. Гэтага ўжо было аж надта дастаткова, каб заманіфэставаць аб станоўчым парваньні із сталінізмам як перад народамі Савецкага Саюзу, гэтак і вонках яго — перад Захадам. Пры гэтым такое заманіфэставаньне было ўтрыманае ў форме належнае прызваітасьці, неабходнае для вярхоўнага кіраўніцтва вялікае дзяржавы.

Аказалася аднак, што гэткай формы адмовы ад сталінізму для цяперашняе крэмлёўскае клікі было за мала. Трэба было паставіць кропку над «і»: сказаць аб усіх чыста сталінскіх злачынствах і поўнасьцю здыскрэдытаваць памерлага дыктатара, як найвялікшага праступніка. Вось тут і выныраe пытаньне, дзеля якой мэты была заінсцэнізаваная ўся гэтая камэдыя?

Некаторыя на Захадзе трымаюцца думкі, што гэтым сваім крокам «калектыўнае кіраўніцтва» хацела мацней пераканаць заходнія колы, што яно не намеранае далей кантынуаваць сталінскай цьвёрдай палітыкі, а гатовае на далёка йдучыя кампрамісы для справы захаваньня міру й наладжаньня шырокага супрацоўніцтва з Захадам. Гэтае прыпушчэньне нам выдаецца найменш праўдападобным. У дачыненьні да Саветаў Захад ёсьць так мала вымагаючым, што для яго дастаткова было ўжо столькі, сколькі было сказана ў прамовах на адкрытых сэсіях зьезду.

На нашую думку, на выступленьні Хрушчова заважылі нутраныя прычыны ў Савецкім Саюзе і **толькі нутраныя.** Публічна вылічаючы цяжкія праступкі Сталіна, як расстрэл каля пяці тысяч савецкіх ахвіцэраў у сувязі із справай Тугачэўскага, крывавы масавы тэрор за часоў яжоўшчыны або віну за няўдачы й вялізарныя страты ў першай фазе апошняй вайны, ды звальваючы віну за ўсё гэта выключна на аднога Сталіна, Хрушчоў мог мець на мэце ачысьціць сябе й сваю кліку ад усіх сталінскіх праступкаў, змора якіх, відаць, жыве ў памяці падсавецкіх народаў. Гэты намер Хрушчова пацьвярджае й тое, што і цяперашнія сябры «калектыўнага кіраўніцтва», як Молатаў, Булганін ды і ён сам, як зазначыў у сваей прамове, мелі стацца таксама ахвярамі сталінскага тэрору. Хрушчоў не дарма прадставіў сытуацыю пры Сталіне так, пры якой Сталін мог рабіць дасьлоўна ўсё, чаго вымагалі ягоныя дзікія капрысы, а ўсе іншыя былі бясьсільныя. Із сьлязамі ў вачох прыпомніў, што навет яму Сталін быў загадаў танцаваць гапака, і ён мусіў гэты несамавіты загад выканаць.

На гэтым не канец. Як ведама, эканамічная сытуацыя Савецкага Саюзу, асабліва ў галіне сельскае гаспадаркі сяньня проста катастрафальная. Грандыёзныя пляны Хрушчова асваеньня цалінных земляў, як ведама, далёка ня далі тых вынікаў, якіх партыя спадзявалася. Ня выратаваў палажэньня й жалю годны плян кукурузацыі ўсяе краіны. Хіба-ж не з дабра быў выдадзены закон аб зьмяншэньні й ліквідацыі прысядзібных надзелаў, якія былі для калгасьнікаў апошняй дошкай ратунку. Новы шасьцілетні плян, кладучы галоўны націск на разьвіцьцё цяжкай індустрыі, мала прысьвячае ўвагі разьвіцьцю сельскае гаспадаркі і падняцьцю жыцьцёвага ўзроўня працоўных масаў. Пры такой бязвыхадна цяжкай сытуацыі трэба лічыцца з эвэнтуальнасьцю, што сярод савецкага насельніцтва можа зрадзіцца легэнда аб добрых і шчасьлівых часох пры Сталіне і аб тым, што пасьля ягонае сьмерці сталася шмат горай. Антыхрушчоўскія дэманстрацыі ў Закаўказьзі, асабліва ў сталіцы Грузіі Тбілісі, як адказ на дыскрымінацыю Сталіна, гэткую эвэнтуальнасьць выразна пацьвярджаюць. Значыцца, каб адхіліць такую нявыгадную сытуацыю, трэба зьнішчыць сярод насельніцтва аўтарытэт Сталіна і адсьвежыць у памяці ўвесь жах ягоных праступкаў.

Ня выключана, што ў Савецкім Саюзе ёсьць многа прыхільнікаў сталінізму, якія ўжо сяньня творацъ паважную апазыцыю ў дачыненьні да хрошчоўска-булганінскага «калектыўнага кіраўніцтва». Ізноў-жа ўспомнены выпадак з каўкаскімі дэманстрацыямі такую магчымасьць пацьвярджае. А такая апазыцыя магла-б стацца паважнай загрозай для сяньняшніх крэмлёўскіх валадароў, тым болей, што магла-б яна шмат што выкарыстаць, каб здыскрэдытаваць у вочох масаў усе несамавітыя экспэрымэнты Хрушчова, якія праводзяцца на прыкладзе гэтых масаў і за іхны кошт.

Гэтая апошняя нашая здагадка для вытлумачэньня сэнсу цяперашніх выпадкаў у Савецкім Саюзе, здаецца, мае найболей абаснаваньняў. А калі так, дык трэба мець пэўнасьць, што гэта толькі пачатак. У сьлед за асуджэньнем Сталіна ў найцяжэйшых злачынствах мусіць тады прыйсьці масавая чыстка і ўсіх сталінцаў. Такая чыстка, пэўне-ж, абняла-б ня толькі людзей, абвінавачаных у сталінізьме, але і ўсе праявы падсавецкага жыцьця ды ўсе навет вонкавыя азнакі савецкага быту, якія зьвязаныя зь іменем Сталіна і зьяўляюцца выражэньнем ягонага культу.

Таму ня было-б ніякага дзіва, калі-б усе Сталінграды, Сталінабады, усе калгасы, заводы, вуліцы імені Сталіна раптам былі перайменаваныя, а пляцы ўсіх гарадоў былі ачышчаныя ад ягоных памятнікаў. Можна сабе выабразіць, які вялізарны пераварот абазначала-б такая акцыя ў некаторых дзялянках духовага жыцьця, як, прыкладам, у літаратуры. Бадай што ўвесь дасюлешні літаратурны багаж такіх беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў, як П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, М. Лынькоў, К. Крапіва й дзесяткі іншых пайшоў-бы на макулятуру, а самі аўтары, калі-б ня былі «вычышчаныя», мусілі-б пачынаць ад пачатку.

Паўтараем, што ўсё гэта толькі нашыя здагадкі. Але здагадкі не пазбаўленыя дастатковага абаснаваньня. У кажным выпадку адно для нас астаецца пэўным: на хрушчоўскай дыскрымінацыі Сталіна справа з антысталінізмам не закончыцца, а прынясе нам не адну яшчэ сэнсацыю. Нязвычайная вайстрыня й станоўкасьць гэтае дыскрымінацыі гаворыць за тым, што гэта толькі яшчэ пачатак. Пажывём — пабачым!

Л. К.

Бальшавікі хвалююцца

1-га красавіка гэтага году ў тыднёвіку «Новое Время», што выдаецца ў Маскве ў расейскай і чужаземных мовах, зьявіўся вельмі цікавы артыкул. У ім вычуваюцца ноткі ня толькі непакою, але й проста-ткі панікі. У чым-жа справа? Вось-жа, бургомістр Нью Ёрку Робэрт Вагнэр адмысловай граматай абвесьціў дзень 25-га сакавіка Беларускім Днём у Нью Ёрку з нагоды 38-ых угодкаў абвешчаньня вольнай і незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Хваляваньне тыднёвіка «Новое Время» зусім зразумелае. Бальшавіком не на руку, што жыхаром найбольшага гораду ў наймагутнейшай вольнай краіне прыпамінаюць аб камуністычным гвалце над воляй народу ў ваднэй з сучасных савецкіх рэспублік. Абыйсьці моўчкі гэты факт, відаць, «Новое Время» не магло. Таму заставаўся адзіны выхад — стары сталінскі мэтад хвальшаваньня гістарычных фактаў, ці навет нязначных дробязяў. Стараючыся здабыцца на гіронію, артыкул піша: «Сп. Вагнэр радзіўся ў 1919 годзе, і можа ня памятае, што дзеілася ў Менску ў 1918 годзе». Хвальш з самага пачатку, бо Робэрт Вагнэр радзіўся ў 1910-ым, а не 1919 годзе, як падае «Новое Время». Калі-б гэта навет было праўдай, дык каго такі сьмешны аргумант пераканае? Ці трэба быць абавязкава навочным сьветкам гістарычных падзеяў, каб быць пэўным у іх аўтэнтычнасьці? Ад народу ня ўтоіш аб'ектыўнае праўды, навет ужываючы сталінскіх мэтадаў. Аднак бальшавіком нічога іншага не застаецца, і ў гэтым выпадку яны й далей верна крочаць па шляху свайго папярэдніка. Найлепшым прыкладам гэтага і зьяўляецца ўспомнены артыкул у «Новое Время», які намагаецца прадставіць Беларускую Народную Рэспубліку, як твор рэакцыянэраў і эксплёататараў. У артыкуле чытаем: «У 1918 годзе, пры дапамозе нямецкіх штыхоў, кантрэвалюцыйная Беларуская Рада арганізавала ўрад, які быў выкінуты народам пры першай нагодзе». Як заўсёды ў бальшавіцкай прапагандзе, гэтак і тут — мана на мане едзе, ды маной паганяе. Немцы нічым ня прычыніліся да абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Яна была абвешчана прадстаўнікамі беларускага народу. Аб гэтым бальшавікі ведаюць аж за добра, бо фактычна яны Менск пакінулі ўжо за тыдзень да прыходу Немцаў пад напорам беларускіх вайсковых групаў. Тагачасны Старшыня Саўнаркому Заходняй вобласьці Ляндэр гэтак апісваў свае ўцёкі зь Менску:

«У горадзе пачаўся рух «Беларусаў», якія рыхтавалі выступленьне супраць нас... Калі тав. Пятроў, камандант Савету, увечары выводзіў мяне з Савету праз чорны ход, з параднага ўжо ўварвліся ўзброеныя банды, якія шукалі мяне й таварышоў».

Гэтак пісаў адзін з тагачасных бальшавіцкіх заправілаў на Беларусі ў часапісе «Вперёд» № 1 за 1922 год.

«Новое Время» маніць далей:

«Урад БНР,... зьвярнуў сканфіскаваную зямлю абшарнікам ды ўвёў прымусовую працу на хвабрыках ды ў маёнтках».

Больш заілгацца ўжо немагчыма. Азін з галоўных прынцыпаў, абвешчаны 2-ой Устаўной Граматай, гучэў вось як: «У межах Беларускай Народнай Рэспублікі... зямля перадаецца бяз выкупу тым, што самі на ёй працуюць... Устанаўляецца найбольш 8-мі гадзінны працоўны дзень».

Мы й не спадзяваліся праўды ад рэдактароў тыднёвіка «Новое Время». Але чаму яны так раптам забілі трывогу? Адказ ня цяжка знайсьці ў самым артыкуле. Як ягоны тон, гэтак і зьмест ясна сьветчыць аб адным: бальшавікі пастарому баяцца праўды, якую раскрывае перад вольным сьветам эміграцыя аб камуністычных актах гвалту над паняволенымі народамі Савецкага Саюзу. Яшчэ больш яны баяцца сымпатыяў вольнага сьвету да гэтых народаў. Гэта яшчэ адзін довад, што камуністыя й далей будуць працягваць сталінскую палітыку нацыянальнага й сацыяльнага паняволеньня.

У. С.

Да пытаньня Беларусаў у Польшчы

«4 сакавіка ў Беластоку (Польская Народная Рэспубліка) выйшаў першы нумар беларускай штотыднёвай газэты «Ніва», якая зьяўляецца ворганам Беларускага грамадзка-культурнага таварыства.

«Большая частка нумару прысьвечана першаму арганізацыйнаму зьезду Беларускага грамадзка-культурнага таварыства, які адкрыўся ў Беластоку 26 лютага г. г. На зьезьдзе прысутнічала 400 дэлегатаў ад 143 тысяч беларускага насельніцтва, якое жыве на тэрыторыі Польшчы.»

Гэтак пачынаецца дапіска, што была зьмешчаная ў менскай газэце «Літаратура і Мастацтва» з 17 сакавіка 1956 году. Свайго часу аб выхадзе «Нівы» паведамляла польскае рэжымовае радыё, дзе таксама ўспаміналася і аб тым, што хутка мае выдавацца штодзённік «Беластоцкая Праўда». Ня маючы пакуль што пад рукамі ніводнага нумару «Нівы» і арыентуючыся толькі паводля карэспандэнцыі «Літаратуры і Мастацтва» цяжка што-небудзь сказаць аб гэтым тыднёвіку Беларусаў у Беласточчыне.

Дзеля таго навязваючы да выхаду «Нівы» і залажэньня Беларускага грамадзка-культурнага таварыства, мы хочам зьвярнуць увагу на іншыя бакі гэтых цікавых падзеяў. Папершае трэба было аж 10 год, каб нарэшце на этнаграфічных беларускіх землях, якімі зьяўляецца Беласточчына, паўстала першая беларуская арганізацыя (і то толькі грамадзка-культурнага характару), ды выйшла першая газэта ў беларускай мове. Няўжо-ж камуністычны рэжым Польшчы толькі цяпер агледзеўся, што ён мае пад сабой і беларускае насельніцтва? Цяжка сказаць, што змусіла Палякаў і іхных крамлёўскіх гаспадароў да гэтага кроку пасьля дзесяцігадовага ігнараваньня правоў беларускага насельніцтва. Ня будзем займацца тут высоўваньнем якіх-небудзь гіпатэзаў. Падругое, зьвяртае ўвагу на сябе сам лік Беларусаў у Польшчы, які падаецца ў «Літаратуры і Мастацтва». Выглядае, што іх там толькі 143 тысячы. Тымчасам, у запраўднасьці справа прадстаўляецца зусім інакш. Вось-жа паводля перапісу насельніцтва з 14 лютага 1946 году, у самай Беласточчыне было 117 тысяч толькі праваслаўных Беларусаў; калі ўзяць на ўвагу натуральны прырост, дык цяпер колькасьць іх будзе прыбліжацца да 140 тысяч. Але-ж гэты лік падаваны цяпер Палякамі паўтараны Саветамі мае абыймаць беларускае насельніцтва ўсяе Польшчы. А агульна вядома, што пэўная колькасьць праваслаўных Беларусаў жыве і ў іншых частках Польшчы ды пераважна на заходніх гэтак званых «зьвернутых землях». З гэтага ясна відаць, што і сучасныя польскія рэжымовыя дзейнікі трымаюцца старой практыкі з часоў перадваеннай Польшчы, гэта значыць аўтаматычна залічаюць Беларусаў каталікоў да Палякаў. А лік 143 тысячы прадстаўляе ў запраўднасьці толькі праваслаўнае насельніцтва Беласточчыны.

Тое, што ў самой Беласточчыне больш за поўмільёна Беларусаў каталікоў, польскія камуністычныя дзейнікі не бяруць на ўвагу. Беларусы каталікі для іх — гэта матарыял, коштам якога пры палянізацыйнай акцыі можна паболь-шыць патэнцыял польскае нацыі; з другога-ж боку — толькі залічаючы іх да Палякаў, можна падтрымоўваць міт аб этнічнай чысьціні й аднароднасьці сяньняшняе польскае дзяржавы.

«Выхад першага нумару беларускае газэты ў Польскай Народнай Рэспубліцы зьяўляецца яшчэ адным сьветчаньнем непарушнай дружбы двух братніх народаў», — заканчваецца дапіска ў «Літаратуры і Мастацтве».

Не, на нашу думку, гэта яшчэ не зьяўляецца сьветчаньнем дружбы, бо інакш ня прыйшлося-б Беларусам Беласточчыны чакаць на гэтую падзею аж дзесяць год. І калі-б гэта была запраўдная прыязьнь, дык імя «Беларус» ня зводзілася-б тэндэнцыйна толькі да Беларусаў праваслаўных. Зрэшты, што мае супольнага паняцьце «прыязьнь» з фактам прызнаньня народу права карыстацца сваёй мовай ды права на абмежаваную колькасьць пачатковых школаў і тыднёвую газэту?

Але затое гэты факт зьяўляецца сьветчаньнем таго, што:

1) Былыя перадваенныя польскія статыстыкі адносна этнічнага элемэнту Беласточчыны былі яўна хвальшывымі, пры дапамозе якіх урадавыя дзейнікі імкнуліся давесьці польскасьць гэтых земляў, бо сяньня, паміма вывезеных зь Беласточчыны ў БССР у 1945—46 гадох трыццаці тысяч праваслаўных Беларусаў — тут беларускі элемэнт мае бальшыню.

2) Калі бальшавікі падаравалі гэтыя землі Палякам, дык не таму, што яны польскія, але, як яны ўжо ня раз практыкавалі ў дачыненьні да іншых народаў, каб давесьці сваю прыхільнасьць да Палякаў і гэтым самым здабыць іхную сымпатыю. Яшчэ-ж у 1939—41 гадох бальшавікі лічылі гэтыя землі беларускімі, а сам горад Беласток быў свайго тыпу сталіцай Заходняй Беларусі. За час-жа ад 1941 да 1946 году лічбовыя суадносіны тут між Беларусамі і польскай мяншынёй у васноўным не зьмяніліся.

3) Дзіўнымі й незразумелымі на гэтым фоне становяцца прэтэнсіі бальшыні польскіх эміграцыйных колаў да ўсяе заходняе Беларусі, не гаворачы ўжо аб Беласточчыне. Калі сяньня навет дыктатура ў польскай дзяржаве, хоць-бы сабе й з тактычных меркаваньняў ды толькі часткова, ушаноўвае ў сваіх межах беларускі элемэнт, дык як-жа могуць будаўнікі будучае **дэмакратычнае** польскае дзяржавы ня толькі ігнараваць гэтае пытаньне, але й пасягаць на землі заселеныя іншымі народамі ды дзе наагул ніякага польскага элемэнту няма.

А. Г.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Водгукі сьвяткаваньня

Лювэн (Бэльгія)

У нядзелю 25 сакавіка беларускія арганізацыі ў Бэльгіі сьвяткавалі 38-ю гадавіну Вялікага Сакавіковага Акту.

Сьвяткаваньне пачалося Божай службай у беларускай праваслаўнай капліцы ў Лювэне. Службу правіў а. Аўген і хор БСЗ сьпяваў пад кіраўніцтвам а. Робэрта ван Ковэлярта.

На Багаслужбе, акрамя Беларусаў, прысутнічала шмат і чужынцаў (Украінцаў, Расейцаў і інш.). У канцы службы а. Аўген у сваім казаньні насьветліў важнейшыя мамэнты Сакавіковага Чыну, а также, прааналізаваўшы жыцьцё беларускае эміграцыі. зьвярнуўся да Беларусаў, каб не забываліся аб тых абавязках, якія ад іх вымагае Бацькаўшчына.

У Беларускім Студэнцкім Доме за агульным сталом сабраліся прысутныя Беларусы. Прыемна было бачыць залю запоўненай, што апошнімі часамі ў Лювэне не заўсёды здараецца.

А 14-ай гадзіне пачалася ўрачыстая акадэмія. Старшыня БСЗ сп. Мак, адчыніўшы акадэмію, надчыркнуў важнасьць Сакавіковага Акту ў беларускім жыцьці. Ён зазначыў, што гэты Акт ёсьць доказам жыцьцяздольнасьці нашага народу. Пасьля старшыня БСЗ папрасіў прысутных хвілінаю цішы ўшанаваць памяць загінуўшых змагароў за беларускую справу; хор адсьпяваў жалобны марш «Сьпі пад курганам герояў».

Рэфэрат на тэму «Да праблемы нацыянальнасьці» прачытаў сп. Сенькоўскі. Дакладчык адыйшоў ад тэмаў, якія звычайна ў нас бяруцца пры нагодах нацыянальных сьвятаў. Гэтым разам тэма была нацыянальна-эканамічнага характару. Дакладчык накрэсьліў прабег агульнай гісторыі ад францускай рэвалюцыі, пытаньне нацыянальнасьцяў у 19-ым стагодзьдзі і ягонае разьвіцьцё, фармаваньне новых дзяржаваў, фармаваньне, супэрнацыянальных блёкаў у 20-ым стагодзьдзі, эканамічную залежнасьць дзяржаваў. На гэтым фоне дакладчык прадстаўляў Беларусь, ейную жыцьцяздольнасьць і пэрспэктывы ў сучаснай эканамічнай залежнасьці. У гэтым параўнаньні былі дадзеныя адказы на закіды, якія нам ставяць найбольш суседзі, быццам Беларусь ня здольная быць незалежнай дзяржавай. Беларусы самі ведаюць, працягваў дакладчык, аб сучасных эканамічных і палітычных залежнасьцях між дзяржавамі, аднак выбар сваіх будучых партнэраў павінны зрабіць Беларусы самі.

Мастацкая частка склалася з колькіх патрыятычных песьняў ды вершаў. Хорам кіраваў сп. Кіслы.

На заканчэньне а. Робэрт вітаў Беларусаў з 25 Сакавіком, сказаў колькі словаў у сувязі з рэфэратам аб нацыянальнасьці. Ён параўнаў беларускае змаганьне за незалежнасьць з колішнім змаганьнем Бэльгійцаў. Выходзячы з гэтага параўнаньня, а. Робэрт пажадаў, каб і лёс Беларусі ў хуткім часе вырашыўся падобна як і лёс ягонае краіны ў 1830 годзе. З другога боку, ён зьвярнуўся да студэнтаў, каб кажнага абавязкам быў удзел у будаваньні Беларусі сваімі стараньнямі ў навуцы і ў штодзённай працы, каб лювэнскія студэнты ўнесьлі свой доўт у скарбніцу Беларусі.

В. Ш.

Мэльдурн (Аўстралія)

38-ыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі адсьвяткаваліся ў Мэльбурне ў прыгожым сяброўскім настроі і ў прысутнасьці немалой колькасьці Беларусаў. Акадэмія ладзілася Згуртаваньнем Беларусаў у Вікторыі.

Айцец Вініцкі, апякун БАПЦ, супольна з айцом Барысам адслужылі Багаслужбу ў УАПЦ у Мэльбурне. Папаўдні ў залі Сьв. Лукі адбылася акадэмія. Пасьля прачытаньня прывітаньняў ад архіяпіскапа Сяргея — галавы УАПЦ ды архіяпіскапа Сільвэстра — галавы ЎАПЦ і пасьля праслуханьня малітвы «Магутны Божа», старшыня ЗБВ сп. М. Скабей забраў уступнае слова. «Хаця і шляхі розныя ў змаганьні, — казаў ён,— мэта тая самая ў сэрцы кажнага Беларуса, і прыдзе час, калі Беларус будзе сам гаспадаром на сваей зямлі».

Пасьля праслуханьня «Пагоні», сп. праф. М. Нікан прачытаў рэфэрат, які зьмяшчаў у сабе крытычны агляд гісторыі Беларусі і ўсіх тых падзеяў, якія вялі да Акту 25 Сакавіка. У вадказ імпэрыялістым-недзялімцам, якія даводзяць, што быццам-бы масы беларускія ня маюць ніякіх незалежніцкіх тэндэнцыяў, рэфэрэнт прыводзіць тры прыклады галоўных падзеяў з навейшае беларускае гісторыі, у якіх якраз і выражаецца воля народу: Акт 25 Сакавіка, Слуцкае Паўстаньне, бесьперапынная барацьба на Бацькаўшчыне аж да сяньняшняга дня.

Прысутныя ўшанавалі хвілінай маўчаньня герояў загінуўшых у змаганьні за Акт 25 Сакавіка.

У артыстычную частку акадэміі ўвайшлі творы Я. Купалы і шматлікія народныя песьні з плітак, найграных рознымі беларускімі ансамблямі. Акадэмія закончылася адсьпяваньнем нацыянальнага гімну.

Падчас неафіцыйнай часткі, прысутныя на адозву сп. праф. М. Нікана ахвяравалі 4 фунты 18 шылінгаў 7 пэнсаў на беларускую нацыянальную школу ў Мэльбурне.

М. Андрэйчык

Нью Ёрк (ЗША)

23 сакавіка гг. Мэр гораду Нью Ёрку Робэрт Ф. Вагнэр праклямаваў дзень 25 Сакавіка 1956 г. **Беларускім Днём** гораду Нью Ёрку.

Ад імя мэра амбасадар Рычард Ц. Паттэрсон прыняў беларускую дэлегацыю а гадз. 11 раніцай і ўрачыста ўручыў Праклямацыю старшыні акруговай Управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сп. К. Мерляку ў прысутнасьці прадстаўнікоў гораду і прэсы.

Беларуская дэлегацыя ў знак удзячнасьці падарыла амбасадару Рычард Ц. Паттэрсону зборнік паэзіі Я. Купалы «Спадчына» з адмысловай дэдыкацыяй.

БЮРО БУРГОМІСТРА МЕСТА НЬЮ ЁРК

ГРАМАТА

Дзеля таго, што:

на дзень 25 сакавіка 1956 году прыпадаюць 38-я ўгодкі абвешчаньня вольнае й незалежнае Беларускае Народнае Рэспублікі і Беларусы па цэлым сьвеце адзначаюць гэты дзень, як успамін аб калішняй свабодзе, ды

Дзеля таго, што:

любоў да свабоды й дэмакратыі ўсё-ж жыве ў сэрцы беларускага народу, ня гледзячы на камуністычнае паняволеньне, ды што ягоная непахісная вера й адвага заўсёды перамогуць агрэсара, які дамагаецца ягонага канчальнага паняволеньня, ды

Дзеля таго, што:

нашы грамадзяне беларускага паходжаньня, якія карыстаюцца прывілеямі нашага вялікага народу, у іхным імкненьні да поўнага вызваленьня паняволенага народу на бацькаўшчыне, асабліва адзначаюць гэты дзень, прысьвечаны беларускай дэмакратыі й свабодзе;

Таму я, Робэрт Ф. Вагнэр, Бургомістр места Нью Ёрк, гэтым абвяшчаю нядзелю 25 сакавіка

Беларускім Днём

у месьце Нью Ёрк, ды заклікаю ўсіх грамадзян далучыцца да Беларусаў у дамаганьнях міру, свабоды й справядлівасьці ў сьвеце.

Робэрт Ф. Вагнэр
Бургомістр места Нью Ёрк.

Гэтага-ж самага дня губэрнатар штату Нью Джэрсі Робэрт Б. Мэйнэр праклямаваў дзень 25 Сакавіка 1956 г. **Беларускім Днём** у штаце Нью Джэрсі.

БЮРО ГУБЭРНАТАРА

ГРАМАТА

Дзеля таго, што,

25-га сакавіка 1918 году Беларусь была абвешчана сваім дэмакратычна выбраным нацыянальным Кангрэсам свабоднай і незалежнай Рэспублікай; ды

Дзеля таго, што,

ня гледзячы на тое, што гэтая Рэспубліка ўпала пад наступам збройнае сілы расейскіх камуністых-імпэрыялістых, супраціў беларускага народу чужому камуністычнаму таталітарнаму рэжыму ніколі ня спыняўся, і мільёны беларускіх патрыётаў усё-ж спадзяюцца адваяваць нацыянальную незалежнасьць ды дэмакратыю для свае бацькаўшчыны;

Дзеля таго, што,

супраціў беларускага народу савецка-расейскай уладзе і бязбожнай камуністычнай сыстэме зьяўляецца натхненьнем для прыхільнікоў свабоды й дэмакратыі ў цэлым сьвеце ды сталай крыніцай клопатаў ягоным паняволенікам, і праз гэта заслугоўвае сымпатыю, маральную й матарыяльную падтрымку цэлага вольнага сьвету; ды

Беларуская дэлегацыя пры ўручэньні амбасадарам Рычард Ц. Паттэрсон Праклямацыі абвешчаньня дня 25 Сакавіка Беларускім Днём гораду Нью Ёрку. Зь лева на права: сп-ня Н. Арсеньнева, сп. Юры Станкевіч, сп. К. Мерляк, сп. А. Шукелайць, Амбасадар Рычард Ц. Паттэрсон, сп. М. Тулейка, сп-ня Г. Ганчарэнка, сп. Б. Данілюк.

Сіла ў зямлі

«Савецкія людзі бачаць у камуністычнай партыі ўвасабленьне мудрасьці, энэргіі й гаспадарчага вопыту» — гістэрычна ўбівае ў галовы сваім слухачом менскае радыё сьледам за «Зьвяздой» з трэйцяга красавіка.

Партыя — увасабленьне энэргіі? — Так, але энэргіі накіраванае на замацаваньне калгаснага рабаўласьніцтва, пра ступнае энэргіі... Партыя мае таксама й «гаспадарчы вопыт», асабліва ў вабдзіраньні сялянска-калгаснае гаспадаркі.

Бо вось тое-ж менскае радыё 28 сакавіка, калупаючыся ў хламе розных пастановаў аб павышэньні сельскагаспадарчае вытворчасьці, выпарала для ўслугі калгаснага кіраўніцтва на Беларусі такую параду-прыклад:

«Вышукваючы шляхі ўздыму, — апавядаў дыктар менскага радыя, — калгас імя Мікаяна Гомельскага раёну яшчэ ў 1954 годзе ўвёў штомесячнае авансаваньне калгасьнікаў. **З таго часу калгасьнікі кажны месяц атрымліваюць грошы на харчаваньне.** Гэтае мерапрыемства зьявілася рашаючым у пераадоленьні адставаньняў грамадзкае гаспадаркі калгасу і людзі пачалі дружна выходзіць на працу...».

Прыклад гэты мае служыць іншым калгасам як паказьнік для пераадольваньня неахвоты людзей выходзіць на дзяржаўную паншчыну. Відаць, да кіраўнікоў іншых сельскіх арцеляў яшчэ не дайшла гэтая глыбокая тайніца «крутога ўздыму» — даваць штомесяцу калгасьнікам хоць на прахарчаваньне штонебудзь...

Але тут важна іншае. Беларускае сялянства па сваёй псыхіцы ды па сваёй натуры было заўсёды элемэнтам наважанага супраціву бальшавіцкаму насільству. У часе крывавае сталінскае калектывізацыі, у гэтым супраціве, наш народ панёс нязьлічоныя страты ў людзёх і нацыянальнай гаспадарцы. Упорыстым і непакорным беларускае сялянства засталося й да апошняга часу.

Адкуль-жа ў яго бралася столькі сілы? — Раней селянін чэрпаў яе з свайго собскага кавалка зямлі, права ўласнасьці над якім вечна было ягонай канчальнай мэтай. Гэтая зямля забясьпечвала сялянству ня толькі незалежны быт з працы рук сваіх, але й незалежнае думаньне ды ацэньваньне палітычных зьявішчаў, Агітаваць, круціць-муціць селяніна, куды цяжэй, чымся хвабрычнага работніка ці франтавога жаўнера. Ягоны-ж «здаровы мужыцкі розум» увайшоў у прыказку, як разважлівы й самастойны.

Сталінская калектывізацыя наважыла найцяжэйшыя ланцугі на самастойнасьць сялянства. З мамэнтам, як у яго ня стала зямлі, зьнікла й незаменная крыніца ягонае сілы. Гэркулес дыктатуры перамог Антэя сялянства, адарваўшы яго ад зямлі.

Аднак, у скалектывізаванага селяніна застаўся яшчэ, хоць мізэрны, спосаб ратунку ад **поўнае** залежнасьці ад дзяржаўнае эксплятацыі й камуністычных агітатараў. Гэта была свая невялікая прысялібная дзялянка ды выраблена вякамі самастойнасьць думаньня.

Цяпер, калектыўная дыктатура павяла наступ на гэтую апошнюю астою сялянскае незалежнасьці — на прысялібныя дзялянкі. Мала таго, яна намагаецца пераламаць карэнным чынам сялянскі спосаб жыцьця. Савецкі дзяржаўны апарат сілай пачынае ламаць псыхалёгію селяніна, які ад вякоў меў цьвёрда выпрацаваны свой уласны быт, маючы за асноўны цыкль яго сельскагаспадарчы год. Селянін цяпер, у канчальных плянах дыктатуры, павінен стацца дзяржаўнай собскасьцяй пры дапамозе штораз узмоцніванага пераводу яго з гадавое аплаты на штомесячную. Ён павінен адчуць, што ён цалкам залежны ад дзяржавы, якая, робячы ласку, дае яму «авансы» на штомесячнае прахарчаваньне. У канчальным выніку, селянін павінен будзе зьвесьціся да статусу хвабрычнага работніка, да стану дзяржаўнага парабка.

Гэтага напэўна не спадзявалася сялянства ў часы рэвалюцыі. Гэтага не чакалі беларускія земляробы, калі яны ламалі стары рэжым царскае Расеі. Але з гэтым яны й не памірацца, бо селянін, як ніхто лепш, адчувае, што ягоная сіла й незалежнасьць спачываюць у сваёй уласнай зямлі.

Янка З.

ЯКУБ КОЛАС 18)

У палескай глушы

Дзеці рассыпаліся па лесе і агаласілі яго сваім крыкам і шчэбетам. Лабановіч доўга шукаў маладую грушку. Ён хацеў знайсьці прыгожанькую грушку і пасадзіць яе на памяць аб сваёй каханай.

Знайшоўшы маладое, крэпенькае і стройнае дрэва, ён доўга і асьцярожна капаўся каля яго, пакуль акуратненька ня было яно выкапана разам зь зямлёю. Сам нёс яго дамоў, пасадзіў у куточку на школьным дварэ, дзе найболей сьвяціла сонца, і два разы паліў вадою ў гэты дзень. Пасьля агарадзіў гэту грушку высокімі кольлямі, каб не патаптала і не паламала яе жывёла.

На кажнае дрэва вызначыў ён вучняў, даручаючы ім догляд за выхаванцамі.

— Ну, а цяпер, дзеткі, ідзіце абедаць. Па абедзе зьбярыцеся і прынясіце свае кнігі, бо пасьля Вялікадня парассыпаецеся вы па лясах і палях. А хто захоча хадзіць у школу і па Вялікадні, той потым і атрымае кнігу.

Прыняўшы па абедзе кнігі ад вучняў і пусьціўшы іх на сьвяты, Лабановіч пачуў, як-бы яму стала чагось шкада, хоць, праўду сказаць, крыху дакучыла за зіму гэта работа па восем і па дзесяць гадзін у дзень.

Ён вышаў на двор, абышоў пасаджаныя дрэвы, над некаторымі затрымліваўся даўжэй. Ён часта паглядаў на двор пана падлоўчага. Вельмі хацелася пабачыць Ядвісю і паказаць ёй гэту слаўную грушку, якую пасадзіў ён на памяць аб ёй. Але Ядвіся доўга не паказвалася на дварэ. Ён падкаравульваў яе з гадзіну. І калі заўважыў, аклікнуў і папрасіў яе падысьці.

Яна радасная і вясёлая, падбегла.

— Я хачу паказаць вам грушку.

— А вы ня будзеце лавіць мяне? — зь мілаю і хітраю ўсьмешкаю спытала яна.

Ён памог ёй пералезьці цераз плот і павёў да грушы.

— Гэту грушку я пасадзіў на памяць аб вас.

Яна доўга разглядала яе. Потым засьмяялася і сказала:

— Я вырву яе і выкіну.

— Чаму?

— Бо яна такая-ж калючая і дзікая, як я.

— Пойдзем гуляць сяньня? — спытаў ён.

— А вы памятаеце, што я вам учора на гэта сказала?

— Зрабіце вы тое самае, што зрабілі ўчора, і тады скажыце мне хоць дзесяць разоў тое, што сказалі адзін раз.

Яна паглядзела на яго строга і прамовіла:

— Больш ніколі! Чуеце? Ніко-о-лі!

XXXI

Вербніца і Благавешчаньне ў гэтым годзе прыпалі на адзін дзень. На сьвята павінен быў прыехаць з Малевіч а. Мадэст зь дзякам Цішкевічам, бо ў гэты дзень цельшынцы па старому звычаю зносілі свае грахі папу, пасьля чаго ўжо рабіліся як-бы сьвятыя. Праўда, у Цельшыне было многа такіх паляшукоў, як, напрыклад, дзед Мікіта, да якіх сьвятасьць не падыходзіла ніякім чынам. І замест таго, каб здаць старыя грахі, яны ня толькі не здавалі іх, а набіраліся яшчэ новых.

Звычайна а. Мадэст прыязджаў напярэдадні пад вечар. Так і сяньня прыехаў ён досыць рана, калі яшчэ сонца не пасьпела схавацца за дубам, што стаяў з боку разьезду. Счакаўшы з поўгадзіны, з каплічкі. што стаяла ў зарасьлі панурых і цёмных магілак, панёсься глухі звон, як-бы гэта званілі ў які-небудзь шчарбаты чыгун. Тым ня меней, звон гэты, такі рэзкі і такі нязвычайны для Цельшына, рабіў моцнае ўражаньне. І кажны, хто чуў яго тут, так ці іначай аказваўся на гэты звон.

— А што гэта? — пытаўся хто-небудзь зь цельшынцаў. — Звоняць ці што?

— А мабуць звоняць.

І пасьля гэтага вяліся тыя ці іншыя разважаньні.

— Ужо, мабуць, піп прыіхаў: штось забомкалі.

— Спавядацісямем?

— А мабуць, шчо так.

Але паляшукі ня вельмі кідаліся да царквы, бо яны народ дбалы і дасьціпны. Таму паляваньне ўсьміхалася нападна, у другога было асочана месца, дзе яшчэ шчупакі ня скончылі нераставаць.

І цельшынскі звон, як відаць, добра ведаў звычаі сваіх парахвіян, бо не сьпяшаўся канчаць скліканьне. Толькі праз гадзіну, калі ўжо на цьвінтарыку зьбіралася досыць многа паляшукоў і паляшучак, а з дворыка Міхалкі Кугая паказваўся а. Мадэст, які ішоў роўна, і дзяк Цішкевіч, у якім было ўсётакі меней «благадаці», з прычыны чаго ён крыху заграбаў нагамі, — ужо тады звон пачынаў заліваццa ямчэй, прыхватваючы для гэтага сваіх меншых тонкагалосых братоў.

Каплічка адмыкалася. Каля дзьвярэй звычайна стаяла колькі маладзіц зь дзецьмі на руках. Яны ня сьмелі самі ўвайсьці ў капліцу, бо былі яшчэ «нячыстыя». Маладзіцы мелі розныя тэрміны: каму трэба было «ўводзіцца» каля Сёмухі, каму каля Пятра, каму на Каляды, а хто яшчэ і зусім ня вытрымаў свой тэрмін. Але ў Цельшыне гэта ня мела значэньня. Айцец Мадэст стаўляў цэлы шэраг маладзіц у капліцы па абодва бакі дзьвярэй, браў свой трэбнік і чытаў малітвы, а дзяк Цішкевіч сьпяваў, крыху пагойдваючыся на нагах. Але гэта ня шкодзіла яму назіраць і за «благочинием» у капліцы, бо маладзіцы, былі здарэньні, часамі і штурхаліся або выпіраліся наперад.

— «Еліцы во Хрысьце»... — сьпяваў Цішкевіч, і тут ён заўважаў, што якая-небудзь маладзіца парушала парадак. Тады ён прыпыняў сьпяваньне і навучальна казаў маладзіцы:

— Ня прыся ты, а стой спакойна, — і сьпяваў далей.

— «Крэсьці-і-ісь-це-сяяя!»

А тут ізноў рабілася што-небудзь ня так, як трэба ў царкве.

— Ці чуеце вы, ці не, што я вам кажу? — ужо досыць строга пытаў маладзіц Цішкевіч і ссоўваў бровы. Направіўшы парадак, ён прадоўжаў сьпяваць:

— «Во Хрыста аблекосьцеся!»

Пабачыўшы новы непарадак, Цішкевіч рашуча спыняў сьпевы і ўжо сярдзіта казаў:

— Тфу! Што гэта за праціўная баба! Ці ты ёй кажы, ці не кажы — хоць кол на галаве чашы. — І, ня спускаючы з маладзіц свайго грознага пагляду яшчэ колькі хвілін, Цішкевіч канчаў песьню:

— Алілу-у-у-я!..

Айцец Мадэст нічым тут ня выказваў свайго «я» і даваў Цішкевічу поўную магчымасьць навучаць «паству», бо яны жылі згодна. І гэта была не навіна і ня пяршыня, калі яны дома, у Малевічах, ішлі поруч, падтрымліваючы адзін другога, бо вельмі часта хварэлі ня няўстойку ног. Ідучы дружнаю параю, часамі прыпыняліся на вуліцы і рабілі кароткую параду, куды зайсьці? Яны падымалі галовы, пакладаючыся ўжо тут на свае вочы. І калі перад вачамі стаяла школа, яны і накіроўваліся туды. Узышоўшы на ганак школы, зноў прыпыняліся, і тут часамі бывала між імі невялікая спрэчка, бо, як праўдзівыя хрысьціяне, яны ўступалі першае месца адзін другому. А з тае прычыны, што перад Богам усе роўныя, яны ўваходзілі разам, адначасна. Айцец Мадэст садзіўся першы на крэсла і казаў Цішкевічу:

— Садзіся, дзяча, школа царкоўная і крэслы царкоўныя.

Тут ён вымаў з-за пазухі расы бутэльку, сам цягнуў і дзяку даваў пацягнуць. Настаўніца ня ведала, як трымаць сябе з гасьцямі. Але госьці былі непатрабоўныя, частаваліся сваёю гарэлкаю і закусвалі сваімі языкамі. Яны трохі спачывалі, сьпявалі «Хрыстос уваскрос» і спакойна выходзілі.

Увёўшы маладзіц і крыху панасіўшы іх дзяцей, а. Мадэст прыступаў да споведзі. Паляшукі, збыўшы гэты клопат, за-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

25 Сакавіка

Дзеля таго, што,

тысячы амэрыканскіх грамадзян беларускага паходжаньня, якія жывуць цяпер у Штаце Нью Джэрсі, адзначаюць 38-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі,

Таму я, Робэрт Б. Майнэр, Губэрнатар Штату Нью Джэрсі, гэтым абвяшчаю

нядзелю 25 сакавіка 1956 году

БЕЛАРУСКІМ ДНЁМ

у Штаце Нью Джэрсі і заклікаю да годнага ўшанаваньня гэтае нагоды.

Робэрт Б. Майнэр,
Губэрнатар.

24 сакавіка гг. Акруговая Управа БАЗА Нью Ёрк наладзіла радыёперадачу прысьвечаную 38-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі.

Радыёперадача, якая была падгатаваная і кіраваная сп. Б. Данілюком, распачыналася беларускім нацыянальным гімнам. Праф. А. Адамовіч з гэтае нагоды сказаў прамову, нарысоўваючы гістарычныя падзеі і значаньне акту 25 Сакавіка. Заканчваючы, ён зазначыў: «... сяньня, як і штодня, жывуць сьведамыя Беларусы ўсяго сьвету змаганьнем як мага за зішчэньне абвешчанага 38 год уперад найдаражэйшага ім ідэялу народнае незалежнасьці свае Бацькаўшчыны. Чула пільнуе, натхняе і стараецца, як змогі, кіраваць гэтае змаганьне Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, што й абвесьціла ейную незалежнасьць 25 сакавіка 1918 году ды, змушаная пасьля выйсьці на выгнаньне, дзеіць нясупынна ды спадкаемна дасюль. Жыве й дажывае свайго поўнага вялікага сьвята народнае незалежнасьці шматпакутная, а духам вечна вольная Беларусь!»

Паміж чытаньнем Праклямацыі абвешчаньня 25 Сакавіка Беларускім Днём у горадзе Нью Ёрк надаваліся беларускія песьні з плітак: Пагоня, Партызанскі марш, На Выгнаньні і рэлігійны гімн Магутны Божа, якім і была закончана радыёперадача.

К. Мароз

Буэнос Айрэс (Аргентына)

25 Сакавіка Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне належна адсьвяткавала 38-ыя ўгодкі незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. Божая служба за Беларусь была адслужана прат. Васілём Вячоркам у ятонай царкве ў Бэразатэі, дзе сабраліся сябры Згуртаваньня ды прыхаджане. Пасьля заканчэньня службы, сябры пераехалі ў сьвятліцу ЗБА, дзе адбылася афіцыйная частка. Старшыня Згуртаваньня В. Другавец прывітаў прысутных зь Вялікім Сакавіком, а таксама запрапанаваў ушанаваць памяць тых, якія палі ў змаганьні за Беларусь. Пры гэтай нагодзе была ўшанаваная таксама памяць тымчасовага прэзыдэнта Аргентынскай Рэспублікі Г. Эдуарда Леонарды, які памёр 23 сакавіка гг.

Даклад аб 25 Сакавіку зрабіў сп. П. Саўчыц. Дакладчык падрабязна прааналізаваў этапы змаганьня беларускага народу за сваю незалежнасьць, а таксама падчыркнуў непахісную волю народу да далейшага змаганьня за вялікі ідэял 25 Сакавіка: свабоду і незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі. На заканчэньне афіцыйнае часткі быў адыграны нацыянальны гімн, пасьля чаго дэклямаваліся патрыятычныя вершы.

П. Ліскавецкі

Торонто (Канада)

Сьвяткаваньня 38-й гадавіны абвешчаньня незалежнасьці БНР, ладжанае Беларускім Нацыянальным Аб'еднаньнем, распачалося ў нядзелю папаўдні а гадз. 4.30 у залі Летувіскага касьцёлу сьв. Яна. Было прысутных вельмі шмат людзей і запрошаных чужых прадстаўнікаў, між імі — старшыня гораду Торонто Філіпс, лібэральны пасол фэдэральнага парляманту сп-р Кэрык і кансэрватыўны пасол правінцыяльнага парляманту сп-р Ярэмка, а таксама працаўнічка радыястанцыі СГМЛ з Гамільтону сп-ня Гэйэр.

Былі прадстаўнікі ад іншанацыянальных мясцовых арганізацыяў і спэцыяльна запрошаны зь Нью Ёрку госьць сп-р мгр. Галяк.

Акадэмію адкрыў віцэ-старшыня БНА сп-р М. Пашкевіч. Даклад аб 25-м Сакавіку, дзе аснаўная ўвага была зьвернута на гістарычныя падзеі перад і ў часе 1918 году, прачытаў сп-р мгр Галяк. Для дакладчыка гісторыя вызвольнага беларускага руху, здаецца, закончылася дзесь у дваццатых гадох, бо выглядала, што пасьля таго гэны рух ня меў ніякіх дасягненьняў.

У сваіх прывітаньнях прадстаўнікі канадыйскіх урадавых установаў, скупаватыя на словы, згодна жадалі прысутным Беларусам вызваленьня іх бацькаўшчыны і запэўнівалі, што яны — разам зь Беларусамі ў змаганьні супраць чырвоных тыранаў. Найбольш і найлепш прамаўляла працаўнічка гамільтонскае радыястанцыі сп-ня Гэйэр, шкада; што яна была прадстаўнічкай толькі самой сябе.

Да дадатніх пунктаў мастацкае праграмы трэба залічыць прыгожыя нацыянальныя танцы — «Лявоніха», добра выкананы маладымі дзяўчаткамі: Беразоўскай і Зіняк, ды народныя — «Чарот» і «Крыжачок» — выкананыя танцавальным гуртком БНА. Песьні хору маглі-б быць крыху лепш апрацаванымі. Варта было-б, каб «русская красавіца города Торонто», сп-ня І. Мігай, калі ўжо змушана запяваць солё, навучылася сьпяваць пабеларуску, а перастала парасейску. Найлепш тэхнічна выкананымі былі «Цыганка» і «Плёткі» Шастаковіча, выкананыя вучаніцай балетнай школы Волкава сп-няй Буцько. Шкада толькі, што ані адзін, ані другі зь іх не падыходзілі на ўрачыстую акадэмію, прысьвечаную дню незалежнасьці. На гэткую акадэмію даюцца звычайна скарбы мастацтва нацыянальнага, але ніколі чужога ды яшчэ кабарэтнага. Відаць, што на праграму давалася ўсё, што папала, абы больш.

Калі ходзіць аб анансьёра, варта было-б, каб ведаў мову, якой гаворыць, тым больш калі гэткай мовай зьяўляецца чужая. Відаць, што Беларускае Нацыянальнае Аб'еднаньне гэтым разам зьвярнула аснаўную ўвагу на вонкавы эфэкт і прапаганду, што ў вялікай меры ўдалося.

Усе торонтоцкія тазэты замясьцілі здымкі з акадэміі і прысьвяцілі ёй рэпартажы. Беларускае Нацыянальнае Аб'еднаньне, паміма шматлікіх недахопаў у праграме, зрабіла вялікую й добрую прапаганду для беларускага вызвольнага руху й Беларусі.

Удзельніцы беларускае танцавальнае групы БНА на канцэрце ў Торонто ў дзень 25 Сакавіка

Лёндан (Канада)

На пачатку сакавіка гэтага году беларуская калёнія ў Лёндане заснавала аддзел ЗБК. Старшыня аддзелу — сп. М. Шуст, сакратар — сп. В. Іваноўскі. Першай праявай дзейнасьці новага аддзелу было наладжаньне сьвяткаваньня 38-ых угодкаў Вялікага Сакавіка. Трэба прызнаць, што хаця ня было ані «перапоўненай залі», ані «захопленых чужынцаў», аднак сьвяткаваньне прайшло ў нязвычайна прыемнай атмасфэры. Др. Б. Рагуля зрабіў кароткі гістарычны нарыс на тэму 25 Сакавіка, падчыркваючы змаганьне беларускага народу за канчатковую рэалізацыю беларускіх ідэялаў. Некалькі песьняў ды дэклямацыяў і пасьля супольная вячэра спрычыніліся да замацаваньня сувязяў паміж сябрамі новага аддзелу. Шчырае дзякуй арганізатарам — спадарствам Шуст і Іваноўскім. Шчырыя пажаданьні большых посьпехаў у далейшым.

С. Т.

Садбуры

Сёлетняе сакавіковае сьвяткаваньне было тут найбольш урачыстым. З Торонто гэты беларускі асяродак наведалі: а. Мацукевіч, старшыня Галоўнае Управы ЗБК сп-р мгр. Грыцук, сп-р Ганько й іншыя.

Урачыстая служба за беларускі народ адбылася тут у мясцовай украінскай царкве, пасьля якой а. Мацукевіч сказаў палкае патрыятычнае казаньне. А другой гадзіне распачалася акадэмія ў залі пры украінскай царкве. Адкрыў яе старшыня мясцовага аддзелу ЗБК сп-р Будзька, а даклад прыгодны меў старшыня ЗБК сп-р Грыцук. Пасьля гэтага прамаўляў яшчэ, жадаючы Беларусам посьпехаў у іхнай працы й змаганьні, настаяцель украінскае царквы. Акадэмія закончылася адсьпяваньнем нацыянальнага гімну, пасьля чаго адбыўся супольны абед.

М. К-р

Парыж (Францыя)

У нядзелю 25 Сакавіка гг. нашая калёнія ў Парыжы ўрачыста сьвяткавала 38-ыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

А гадзіне 11 раніцай у Беларускай Капліцы была адпраўлена а. Львом Багаслужба з прынагодным патрыятычным казаньнем.

Пасьля абеду ў вялікай залі Хрысьціянскага Сындыкату, пры вуліцы Мон Толён 26, адбылася ўрачыстая акадэмія, у праграму якой увайшлі: рэфэрат і прамовы гасьцей, артыстычная частка, скромны пачастунак.

Акадэмію адкрыў старшыня Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Францыі сябра М. Наўмовіч. Вітаючы гасьцей і сказаўшы ўступнае слова ў французскай мове аб значэньні Акту 25 Сакавіка, ён зачытаў прывітаньні ад арганізацыяў сяброў з правінцыяў. Ад украінскіх сындыкальных арганізацыяў у Францыі вітаў нас сп. Штыкала, падчыркваючы значэньне супольнай барацьбы Беларускага і Украінскага народаў за іх вызваленьне з бальшавіцка-расейскай няволі.

Рэфэрат аб гістарычных падзеях, якія прывялі да абвешчаньня Акту Незалежнасьці Беларусі і аб далейшай барацьбе нашага народу за ажыцьцяўленьне гэтага Акту, прачытаў сябра В. Міцкевіч.

На заканчэньне афіцыяльнае часткі Акадэміі прамаўляў наш дарагі госьць старшыня Рады БНР сп. Інж. М. Абрамчык, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на стыхійнасьць барацьбы беларускага народу за сваю незалежнасьць, і заклікаў да далейшага яшчэ больш узмоцненага ўдзелу нас, эмігрантаў, у гэтай барацьбе.

Загучэў наш нацыянальны гімн, а «Пагоняй» распачалася мастацкая частка.

З прыемнасьцяй госьці слухалі дэклямацыі сяброўкі Н. Дударэвіч, сябры Міхана, песьні нашых маленькіх артыстак — дзетак сп. Буйвілы, а таксама ўжо ведамых у нашай калёніі сьпевакоў сябры В. Жаўняровіча, які спэцыяльна да нашага сьвята скампанаваў прынагодную мэлёдыю, і сябры Вярбіцкага, які выканаў «Калыханку» Я. Купалы ды колькі народных песьняў.

Пасьля-ж, пад гукі беларускіх народных мэлёдыяў з патэфонных плітак, прысутныя, у мілай сяброўскай атмасфэры, частаваліся пры буфэце. Гутаркі, вясёлы гоман не заціхалі аж да вечара, калі кажны пакідаючы зборку ў бадзёрым настроі вяртаўся да свайго штодзённага жыцьця.

Управа АБРФ

Усім арганізацыям і сябром, якія прыслалі нам свае прывітаньні з нагоды сьвяткаваньня 38-ых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, складаем шчырую падзяку.

Управа АБРФ

Манчэстэр (Ангельшчына)

Кажнага году Беларусы гораду Манчэстэр і ягоных ваколіцаў урачыста абыходзяць беларускае нацыянальнае сьвята 25-га Сакавіка, а ў гэтым годзе было больш урачыста таму, што сьвяткаваньне абходзілася 25-га, якраз у дзень прагалошаньня Незалежнай Беларускай Дзяржавы.

Гэтага дня а гадз. 11,30 у залі Беларускага Дому а. А. Крыт адслужыў Багаслужбу, прысьвечаную 25 Сакавіку, і сказаў прыгожае казаньне, у якім падкрэсьліў, што кажны народ мае свае нацыянальная сьвяты, а ў тым ліку і мы, Беларусы.

Пасьля Багаслужбы ў сьвятліцы Бел. Дому адбылася акадэмія, якую адчыніў, вітаючы прысутных зь Вялікім Сакавіком, старшыня мясцовага аддзелу ЗБВБ сп. Х. К-іч.

Шчыра й сардэчна прывітаў удзельнікаў з Сакавіковым Сьвятам а. А. Крыт

(Заканчэньне на 4-ай бач.)

раз-жа выходзілі з капліцы і ішлі дамоў. Назаўтра зранку таксама ішла споведзь, а потым ужо служылася абедніца, набажэнства, спэцыяльна створанае для паляшукоў, бо звычайна іх доўга ў царкве не затрымлівалі. Невялічкая каплічка, якая магла ўмясьціць якую-небудзь шостую частку цельшынцаў, была напалавіну пустая, і толькі тады, калі пачыналася прычашчэньне, у ёй рабілася цесна, бо кажнаму хацелася хутчэй узяць прычасьце. І тут ужо без канфліктаў ніколі не абыходзілася.

— Што ты мне на ногі ўзьлез? — злосна глядзеў Трахім Буч на Рыгора Качана. — Прэцца, бы тая сьвіньня, — усё яшчэ ў злосьці казаў Буч.

Качан пазіраў на Буча, як-бы разважаючы, што адказаць яму на гэта. Ён успамінаў, што яны ідуць да прычасьця і што не павінны мець гневу ў сваім сэрцы, і, з дакорам ківаючы галавою, казаў, а ў голасе яго чулася скруха.

— Саладушнік ты, шчо-б ты захлынуўся! Ідзеш да сьвятога прычасьця, а лаешся, як сабака, як-бы ты не ў царкве, а ў карчме ў Абрама!

Напамін аб хрысьціянскай пакорлівасьці, зроблены Качаном, меў значэньне і сілу, бо Буч нічога не адказваў і глядзеў перад сабою. А там, каля бацюшкі за чашаю, таксама мітусіўся народ.

— Чаго ты пхаесься? — аглядаецца на суседа паляшук.

— А ты сам куды пражэсса? — адказвае сусед, па мянушцы Швайка, і займае першае месца, а другі сусед, злосны, становіцца за ім, бо сварыцца ўжо няма калі, і Швайка стаіць з разяўленым ротам.

Айцец Мадэст лыжачкаю бярэ з чашы:

— Прычашчаецца раб Божы... Імя?

— Габрусь! — адказвае Швайка.

Угневаны ім сусед дадае:

— Дый яшчэ Швайка!

Швайка зачыняе рот, адварочваецца да суседа:

— Дый яшчэ чорт тоўстаносы!

Потым ён зноў разяўляе рот, павярнуўшыся да чашы.

Айцу Мадэсту таксама ня церпіцца, хоць у справы сваіх парахвіян ён ня мяшаецца. Але калі заўважае што, то выкідае ўсё гэта на вока.

Дзед Мікіта толькі што вярнуўся з рыбы. Відаць, ён сьпяшаўся, каб не апазьніцца на прычасьце, бо моцна засопся і яшчэ ў капліцы зрабіў колькі шпаркіх крокаў, якімі ён ішоў з балота. Ён адапхнуў колькі кабет і стаў наперадзе. І вось, калі дайшла да яго чарга, а. Мадэст зірнуўшы на ногі дзеда Мікіты, заўважыў, што яны па самы пояс былі мокрыя, а лапці плюхцелі.

— Ты чаму-ж гэта мокры прышоў сюды? — спытаў яго а. Мадэст.

— Замачыўся, то і мокры, — адказаў дзед Мікіта, крыху адвярнуўшы ад бацюшкі лысую маршчыністую галаву.

— Дзе-ж гэта замачыўся?

— На болоце, дзе-ж?

— А чаму-ж ты на абедніцы ня быў?

Дзед Мікіта маўчыць.

— Я табе прычасьця ня дам, — накінуўся на яго бацюшка. — Ня мог ты поўгадзіны ў царкве пабыць, памаліцца? Дык ты скарэй на балога, да чарцей пабег, а цяпер, аблюманы і абрынданы, прычашчацца прыпёр? Ня буду прычашчаць! — промовіў а. Мадэст і павярнуўся з чашаю ўбок.

— Го! — сказаў дзед Мікіта, — ня будзе прычашчаць!.. То і ня трэба! Настрашыш ты мяне!

Дзед Мікіта, ні на кога не пазіраючы, ідзе вон з капліцы. Айцец Мадэст колькі хвілін стаіць з чашаю і глядзіць усьлед дзеду... Ён яшчэ думае, што дзед вернецца і папросіцца ў яго. Але дзед Мікіта, той самы дзед, што з жарнавікамі танцаваў, падыходзіць ужо да дзьвярэй:

— Гей! Як цябе там? Вярніся! Чуеш? — гукае а. Мадэст.

Дзед спыняецца, паварочвае галаву да бацюшкі і кажа:

— Ня хочу!

— Вярніся ты! — крычыць а. Мадэст: — Табе ўжо і слова нельга сказаць.

Мікіта адпускаецца і, хлюпаючы лапцямі, зноў ідзе да амбону.

Айцец Мадэст прычашчае яго. Дзед бярэ кусочак прасфары, кладзе ў рот і хоча ісьці.

— Ці злавіў-жа хоць рыбы? — пытае а. Мадэст.

Дзед зусім адпускаецца, глытае прасфару і адказвае ўжо лагодна:

— Дзе там у чорта? Няма! — працягвае ён апошняе слова, махае рукою і выходзіць.

Сьвятая служба канчаецца. Цішкевіч бубніць апошнія малітвы, а. Мадэст ськідае рызы. Малітвы скончаны, кніга загорнута.

Айцец Мадэст падыходзіць да Цішкевіча, яны перакідваюцца колькімі словамі і выходзяць.

На цьвінтарыку духавенства прыпыняецца, знаёміцца зь цельшынскім настаўнікам.

— А вашы вучні добра чытаюць. Учора даў газэту вашаму вучню, Рылку; такі маленькі, а як разьбірае! Права слова! — гаворыць а. Мадэст.

Цішкевіч панура слухае, потым падымае вочы на бацюшку.

— Э, бацька! Ці ты яго хвалі, ці не хвалі, а на чай усё роўна не пакліча!

— Цёмны тут у вас народ! — гаворыць на разьвітаньне а. Мадэст і паволі зь Цішкевічам ідзе да Міхалкі Кугая.

XXXII

На чатвёрты дзень Вялікадня вярнуўся Лабановіч у сваю школу. Яшчэ вечарам таго-ж самага дня, калі цельшынцы здавалі свае грахі а. Мадэсту, надумаўся ён паехаць дадому, каб крыху праветрыцца і хоць на кароткі час адысьціся ад кругу тутэйшых уражаньняў і сваіх настрояў. Але на першыя-ж дні сьвят яго моцна пацягнула сюды, бо быць блізка ад Ядвісі і бачыць яе хоць зрэдку стала яго патрэбаю. Едучы назад, ён ня спаў дзьве ночы, а па дарозе, апрача таго, яму прыходзілася віншаваць таго-сяго ізь сьвятым Вялікаднем і, разумеецца, крыху падвіншавацца. Утомлены бяссоннымі начамі і выпіўкаю, ён пачуў сябе вельмі добра, улёгшыся на сваёй пасьцелі, і зараз-жа заснуў крэпкім сном.

Даведаўшыся, што прыехаў сусед, пан падлоўчы праз поўгадзіны прымасьціўшыся пад акном, дзе спаў настаўнік, барабаніў кулаком у раму і клікаў:

— Прафэсар вельких букваў! О, прафэсар! Чуеш? Уставай піць гарэлку!

Лабановіч спаў крэпка і нічога ня чуў. Падлоўчы быў падвыпіўшы і не адступаўся. Яго кулак часьцей і шмат мацней пачаў барабаніць па сярэдняй раме. Шыбы зазьвінелі, а зь некаторых пасыпаўся кіт.

Падлоўчы Баранкевіч, зьвярнуўшы на гэта ўвагу, засьмяяўся і прамовіў сам сабе:

— Чорт яго бяры, прафэсара: павыбіваю яму вокны!

Лабановіч на гэты раз пачуў грук і скрозь сон дагадаўся, што яго будзіць падлоўчы, але расчыніць вочы і падняць галаву проста ня меў сілы. Калі-ж грук пачаўся з новай сілаю, ён громка прамовіў:

— Га-а!

— Уставай, прафэсар! — гукнуў з двара Баранкевіч.

Лабановіч узьняўся, адчыніў фортку і стаў прасіцца:

— Пане суседзе, ня спаў тры начы — не магу!

— Што за «не магу»? Зараз-жа адзявайся, бо далі-Бог-жа, прыду і павалаку так, як ты цяпер ёсьць. А будзеш упірацца, то паклічу Рыгора і Язэпа і, далі-Бог, прывалачом вось так, як ты цяпер ляжыш. А ў мяне і паненкі ёсьць.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Беларускія кніжкі

Выдавецтва „Бацькаўшчыны"

ЯКУБ КОЛАС
Новая Зямля
Паэма
зь вялікім і грунтоўным крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.
Балонаў 246+XXXII.
Цана 3 амэр. даляры.

ЯНКА КУПАЛА
Тутэйшыя
П'еса ў чатырох дзеях з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.
Балонаў 83.
Цана 1,30 амэр. даляраў.

ЯНКА КУПАЛА
Раськіданае гняздо
Драма ў пяцёх актах з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.
Балонаў 58+XV.
Цана 1 амэр. даляр.

АНДРЭЙ МРЫЙ
Запіскі Самсона Самасуя
Сатырычная аповесьць з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.
Балонаў 88.
Цана 1 амэр. даляр.

ЛУКАШ КАЛЮГА
Нядоля Заблоцкіх
Аповесьць зь вялікім крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.
Цана 1,50 амэр. даляраў.

ЯНКА КУПАЛА
Спадчына
Выбар паэзіі зь вялікім крытычным артыкулам СТ. СТАНКЕВІЧА
Балонаў 564
Цана 7, 9 або 11 даляраў (залежна ад вокладкі й паперы)

ЯКУБ КОЛАС
Сымон Музыка
Паэма з крытычнымі артыкуламі Р. СКЛЮТА і А. БАБАРЭКІ
Балонаў 246
Цана 3 даляры

Ля чужых берагоў
Альманах твораў эміграцыйных паэтаў і пісьменьнікаў з уступным артыкулам СТ. СТАНКЕВІЧА
Балонаў 238
Цана 3 даляры.

Партрэт Янкі Купалы
Разьмер 30×20 см
Цана 50 цэнтаў

У краінах, паза Задзіночанымі Штатамі Амэрыкі й Канадай, цана ў мясцовай валюце, раўнавартаснай выжэй пададзенай цане ў амэрыканскіх далярах.

Выпісваць можна: непасрэдна з Адміністрацыі «Бацькаўшчыны» і з нашых Прадстаўніцтваў у паасобных краінах.

НЕ ПАВІННА БЫЦЬ АНІВОДНАГА БЕЛАРУСА НА ЧУЖЫНЕ, ЯКІ-Б НЯ БЫЎ ПАДПІШЧЫКАМ, ЧЫТАЧОМ І ПАШЫРАЛЬНІКАМ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» І ЕЙНЫХ КНІЖНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ!

Зь беларускага жыцьця

ЛЮВЭН (БЭЛЬГІЯ)

11 сакавіка гг. а. Аўген Смаршчок адправіў паніхіду, ў Беларускай Праваслаўнай Капліцы, прысьвечаную угодкам сьмерці сьв. пам. кампазытара М. Равенскага. У паніхідзе ўзялі ўдзел хор БСЗ пад кіраўніцтвам а. Робэрта ван Ковэлярта і беларуская калёнія ў Лювэне.

ГАДАВАЯ ЛЯТАРЭЯ Ў ТОРОНТО

У нядзелю 18 сакавіка сёлета ў сьвятліцы ЗБК у Торонто адбыўся розыгрыш гадавой лятарэі, арганізаванай Галоўнай Управай ЗБК. Было разаграна каля 50 фантаў. Яны былі назьбіраныя сябрамі ЗБК па крамах у Торонто. Даход зь лятарэі прынёс 120 дал., зь якіх палова пойдзе на царкву Сьв. Кірылы Тураўскага, а палова — на сплату тэлевізійнага апарату для сьвятліцы ЗБК, што быў куплены ўдоўж яшчэ ў мінулым годзе.

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСЬНЯ НА КАНАДЫЙСКІХ ХВАЛЯХ

Кажную пятніцу ад палавіны дзесятае да дзесятае гадзіны вечарам з торонтонцкае студыі дзяржаўнае радыёстанцыі СіБіСі на цэлую Канаду трансьмітуюцца песьні праграмы «Сонгс оф май піпл». На гэтай праграме ў той самы вечар можаце пачуць песьні аднае або двух ці навет больш з дваццаці шасьці нацыянальнасьцяў, што пасяліліся ў Канадзе.

У пятніцу 23.3. сёлета цэлай поўтадзіны (ужо другі раз) было прысьвечана цудоўным беларускім мэлёдыям з нагоды сьвяткаваньня Беларусамі трыццаць восьмых угодкаў Дня Незалежнасьці.

Дзявочы квартэт, што прасьпяваў «Разьвівайся сыры дубе», « Ой ляцелі гусі», «Кума, мая — кумачка, дзе жывеш», а таксама мужчынскі хор заслугоўваюць на пахвалу. Трэба заўважыць, што асабліва шмат можна пажадаць да чысьціні іхнае мовы, але-ж гэта людзі тут народжаныя, і некаторыя наагул зь беларускаю мовай мелі сутычнасьць першы раз. Тое самае адносіцца й да мовы Яна Рубіша, якога надзвычайны бас чараваў слухачоў у выкананьні «Вярбы» й «Кума-кумачкі».

На асаблівую ўвагу заслугоўвае канцэртная адаптацыя «Лявоніхі», «Бульбы» і «Мікіты» сп-ром Іванам Раманавым. Аўтару гэтых радкоў і шматлікім слухачом найбольш да сэрца прыпала «Песьня аб Палесьсі» з опэры Цікоцкага «Дзяўчына з Палесься», апрацаваная на скрыпку й выкананая музычным кіраўніком праграмы сп-ром Раманавым.

Як за гэта, так і наагул за добрую падрыхтоўку праграмы ды выкананьні сп-ру Раманаву належыцца ад Беларусаў вялікая ўдзячнасьць. Праграма стаяла на шмат вышэйшым узроўні, чымся першая. Тыя кароткія, але частыя зацемкі аб Дні Незалежнасьці, Беларусах і Беларусі былі карэктнымі. Пэўна-ж, нам хацелася-б каб было шмат больш і мацней сказана аб беларускім змаганьні за незалежнасьць, але тут у рахунак ужо ўваходзіць мясцовая палітыка, ці, правільней кажучы, палітычнае безгалоўе, якое палягае на патаківаньні Вялікай Брытаніі й віляньні хвастом перад бальшавікамі. Таксама хацелася-б нам у праграме чуць патрыятычныя, ня толькі народныя, песьні.

Гэтым шляхам хочацца зьвярнуцца да ўсіх Беларусаў у Канадзе, каб стала, пісалі ў СіБіСі і дамагаліся часьцейшых беларускіх праграмаў ды каб падавалі свае заўвагі адносна мінулых праграмаў. Трэба ведаць, што СіБіСі дае найбольш часу тым нацыянальнасьцям, з боку якіх адчувае найбольшую прэсію, асабліва асабістыя лісты ад людзей з цэлай краіны. Вось чаму ўсе Беларусы павінны ў добрых пачынаньнях Галоўную Управу ЗБК поўнымі сіламі падтрымаць. Лісты ня толькі можна, але й трэба пісаць так, як хто ўмее, сваімі словамі, паангельску й пабеларуску на наступны адрас:
Producer, Songs of my people, Canadian Broadcasting Corporation, 354 Jarvis Sreet, Toronto, Ont.

Водгукі 25 Сакавіка

МАНЧЭСТЭР (АНГЕЛЬШЧЫНА)

(Заканчэньне з 3-яй бачыны)

ад сябе і ад імя Япіскапату БАПЦарквы. Пры нагодзе ён уручыў Пахвальную Грамату БАПЦарквы спадару Янку Абабурку, які сваёю самаахвярнасьцю шмат спрычыніўся да росквіту БАПЦарквы ў Ангельшчыне.

Вельмі добра прадэклямавала «Я ад вас далёка» і «Роднае — любое» маленькая Іра Д-ко.

Рэфэрат на тэму «25-ы Сакавік» прачытаў сп. Х. К-іч. У гэтым рэфэраце ён усебакова прадставіў і схарактарызаваў таксама змаганьне Беларусаў за незалежнасьць апошніх дзесяткаў гадоў.

Сакавіковае сьвяткаваньне закончылася адсьпяваньнем Беларускага Нацыянальнага Гімну.

М. Стаўпіцкі

На Фонд Беларускай Кніжкі

11. Падпісны ліст № 38, зьбіральнік сп. Я. З. Мюнхен (Зах. Ням.):

Я. Запруднік — 20 ням. марак, Ст. Станкевіч — 20, Ул. Цьвірка — 15, А. Марговіч — 15, С. Кабыш — 15, Ул. Бортнік — 5, П. Сыч — 10, В. Жук-Грышкевіч — 20, Д. Чайкоўскі — 10, Ю. Брэчка — 15, П. Урбан — 15, Р. Казак — 20, Б. Вержбаловіч — 10. **Разам — 190 нямецкіх марак.**

Хрушчоў здароў, а кароўкі дохнуць...

Ведаем, зь якой радасьцяй сустракаў наш селянін вясну, хаця яна прыносіла шмат працы. Весела выходзіў гаспадар араць свае палеткі і выганяў у поле сваю жывёлу. Амбіцыяй і зацікаўленьнем кажнага гаспадара было якнайлепш пракарміць гэту жывёлу да вясны, каб, як у нас казалі, вылінялa яшчэ ў хлеве. Таму і скаціна весела падбрыкваючы й бушуючы бегла першы раз на выган. Усё было нармальна: селянін быў уласьнікам свайго дабытку і дбаў аб ім.

А што-ж мы цяпер назіраем на калгасных палёх і выганах?

Бальшавіцкая прапаганда вельмі крыкліва расьпісваецца аб дасягненьнях партыі, ейных клапотах аб долі працоўных і заможным жыцьці савецкага грамадзтва. Затое гэта прапаганда, а перадусім цэнтральная прэса — якая выходзіць навонкі — старанна ўнікае пісаць аб недахопах, або і нэндзы савецкага жыцьця. Аднак мы з сваей практыкі і із скупых вестак, вылаўленых з савецкае прапагандовай барабаншчыны, можам мець уяўленьне аб запраўднасьці.

24-га сакавіка смаленскае радыё падало даволі невясёлы вобраз з галіны жывёлагадоўлі і надояў малака. Паводля гэтай весткі ў шмат якіх раёнах за дзесяць дзён надойваецца з каровы толькі 17 кіляграмаў малака, а то й менш, хоць усе каровы выцеліліся. Гэта больш чымся мізэрна.

Як заўсёды, савецкая прапаганда шукае вінавайцаў і — як заўсёды — ня там, дзе трэба. Прычына, быццам-бы ў няправільным расстаўленьні камуністычнага актыву райкомаў. Мы-ж дазволім моцна сумлявацца, што галоднай і худой карове паможа, калі яе будзе даіць ня толькі перадавы актывісты раёну, але навет і сам першы сакратар ЦК КПСС, Хрушчоў...

Замест вясёлай і моцнай жывёлы калгасьнікі выганяюць на пустое яшчэ поле шкілеты абцягнутыя скурай, якія, сланяючыся ад ветру, шукаюць купінак леташняе травы. І гэта назіраецца ў шчасьлівых калгасах, дзе скаціна выжыла, бо ў шматлікіх перадохла з голаду ў халодных хлявох. Добра памятаем, як яшчэ ў восень савецкая прэса выяўляла непакой, што запасы корму на зіму былі недастатковыя, і прадбачвала скаціне «галодны паёк». Пэсымістычныя прадбачваньні, як бачым, споўніліся і перапоўніліся.

Але звальваць усю віну на сакратароў райкомаў і старшыняў райвыканкомаў — гэта валіць з хворае галавы на здаравейшую. Прычыны трэба шукаць у іншым месцы.

Возьмем толькі адзін прыклад: Ведаем з даўнейшае практыкі і з сьвежых дасьветчаньняў, што на Беларусі кукуруза не даець пажаданых вынікаў. Інакш кажучы — ня хоча расьці. Дык у мінулым годзе хрушчоўскія кукурузныя фантазіі, якія мусілі зьдзейсьніваць калгасьнікі, прынесьлі вялікія страты. Хопіць прачытаць пастановы ЦК КПБ і Савету Міністраў БССР з 24-га сакавіка г. г., каб аб гэтым пераканацца. Там мы сустракаем невясёлую статыстыку правалу кукурузы. Але адначасна там ёсьць і дырэктывы, каб амаль у пяць разоў павялічыць пасевы кукурузы гэтай вясной. Такім чынам сёлета мае быць засеена кукурузай аж 400 тысяч гэктараў найлепшай бульбяной зямлі з найлепшым угнаеньнем. Рэч зразумела, гэта ня можа не адбіцца адмоўна на ўсёй гаспадарцы.

Аднак на загад тырана-самадура Хрушчова кукуруза будзе сеецца, і будзе новы, толькі яшчэ большы правал. Бо, папершае, там, дзе кукуруза не расьце, яна ня вырасьце і сёлета, а толькі змарнуюцца тысячы гэктараў найлепшае зямлі, шмат працы і ўгнаеньня. Падругое, кукуруза вымагае мноства працы і таму калгасьнікі будуць траціць час для дохлае кукурузнае афэры і гэтым самым будуць занядбоўваць іншую работу. Вынікі прадбачыць ня цяжка: У восень ізноў у савецкай прапагандзе пачуем трывогу аб нястачы корму, зімой зноў будзе здыхаць жывёла, а тая, якая перажыве, наступнай вясной, як сёлета, будзе выходзіць у поле заморанай.

Ці з гэтае прычыны будзе балець галава або жывот Хрушчову і супалцы? Напэўна не. Цярпець будуць калгасьнікі, ужо не гаворачы аб беднай жывёле. Але камуністычная прапаганда будзе барабаніць аб «шчасьлівым і заможным жыцьці» пад кіраўніцтвам «мудрае, роднае камуністычнае партыі».

Таму для нас — адно пэўнае: пакуль гэта антынародная партыя будзе над намі панаваць — цяжка спадзявацца нармальнага жыцьця.

Колькасьць лекароў у БССР

(Аб вартасьці савецкае статыстыкі)

У справаздачным дакладзе на XXII зьезьдзе кампартыі Беларусі першы сакратар КПБ Патолічаў падаваў шмат статыстычных дадзеных, што павінны былі даводзіць высокую ступень дабрабыту беларускага жыхарства.

Між іншага гаворачы пра «клопаты аб далейшым павышэньні дабрабыту працоўных», Патолічаў сказаў (паўтараем за «Зьвязздой» з 26. I. 56): «За апошнія пяць год **колькасьць лекароў** у рэспубліцы павялічылася больш чым на дзьве тысячы чалавек і **на 1 студзеня 1956 году склала 7 904 чалавекі.»**

Аднак Патолічаў, відаць, ня ўлічыў, што ў 1940 годзе таксама была статыстыка, хіба-ж ня менш аўтарытэтная, чымся ягоная на зьезьдзе. Вось-жа ў выдадзенай у 1940 годзе кніжцы «25 лет советского здравохранения» на бачынцы 220 стаіць, што **ў 1940 годзе ў Беларусі было 3 038 лекароў.** Тут-жа варта прыпомніць, што ў 1940 годзе ў склад БССР уваходзіла яшчэ й аддадзеная Польшчы Беласточчына з больш чымся паўмільённым насельніцтвам.

Цяпер, «Советская Белоруссия» з 14 сьнежня 1955 году, гэта значыць, менш чымся за два месяцы да XXII зьезду КПБ, у перадавым артыкуле пісала даслоўна: «У рэспубліцы... колькасьць лекароў, **напрыклад, у параўнаньні з 1940 годам, пабольшылася на 86%.** На працягу двух месяцаў перад зьездам кампартыі Беларусі ня было-ж хіба ніякіх выпускаў мэдыцынскіх школаў. Дык, калі ад 3 038 лекароў у 1940 годзе вылічыць пададзеныя ў «Советской Белоруссии» 86% — гэта дасьць нам 2 613 лекароў. Значыцца, **выходзячы з фактычных дадзеных 1940 году, на Беларусі ў канцы 1955 году было толькі 5 651 лекар,** а не амаль што 8 тысяч, як хлусіў Патолічаў на XXII зьезьдзе КПБ.

У сувязі з гэтым, варта зьвярнуць увагу й на іншы, ня менш важны, мамэнт.

Увесь XXII беларускі рэспубліканскі зьезд партыі быў накіраваны на дэманстраваньне тых дасягненьняў, якія здабыў быццам беларускі народ, дзякуючы сваёй собскай дзяржаве ды раўнапраўю Беларусі ў складзе СССР. Гляньма-ж цяпер, як выглядае гэтае «раўнапраўе».

Дапусьцім, што, гаворачы аб колькасьці лекароў на Беларусі, Патолічаў не схапіў з паветра няіснуючую колькасьць 2 253 лекары, і іх запраўды ў БССР ёсьць 7 904 чалавекі.

Вось-жа «Правда» з 27 сакавіка 1953 году падала, што **па цэлым Савецкім Саюзе адзін лекар прыпадае на 670 чалавек** насельніцтва. «Правда» падала таксама ў травені 1954 году, што **ў РСФСР прыпадала 650 асобаў на аднаго лекара.** А на Беларусі? —

Падзялем 10 з паловай мільёнаў насельніцтва БССР на 7 904 лекары і атрымаем аднаго лекара бадай на 1 327 чалавек, г. зн. у два разы менш, чымся ў сярэднім па Савецкім Саюзе. Але-ж у запраўднасьці лекароў на Беларусі ня 7 904, а, як даведзена вышэй, — 5 651, г. зн. **адзін лекар прыпадае ў сярэднім на 1 858 асоб** — бадай у тры разы менш, чымся, прыкладам, у Расейскай Фэдэратыўнай Рэспубліцы.

Параўнаньні гэтыя, бясспрэчна, не абазначаюць, што ў БССР замала выпускаецца абсальвентаў з мэдыцынскіх навучальных установаў. Гэта даводзіць толькі, што беларускія лекарскія сілы раскідаюцца дыктатурай па бязьмежнай савецкай імпэрыі, і Беларусь, у рамках Савецкага Саюзу, страшэнна занядбаная з гледзішча на інтарэсы ейнага насельніцтва.

Р. Л.

„Беларускі Зборнік"

Інстытуту для Вывучэньня СССР. № 2, 1956., бачынаў 146

Апошнім тыднем выйшаў з друку другі нумар «Беларускага Зборніка» Інстытуту для Вывучэньня СССР у ангельскай мове, які, у пераважнай меры зьяўляецца ангельскай вэрсіяй «Беларускага Зборніка № 3, што выйшаў яшчэ ў студзені ў беларускай мове на рататары. Зьмест апошняга ангельскага зборніка наступны:

1. **Л. Гарошка** «Савецкая рэлігійная палітыка пасьля 1942 г.»
2. **М. Волаціч** «Лінія Кэрзона й тэрытарыяльныя зьмены ў Усходняй Эўропе».
3. **Л. Вароніч** «Гісторыя Беларусі ў працах савецкай гісторыяграфіі».
4. **С. Кабыш** «Ураджай 1955 году ў СССР».
5. **А. Архімовіч** «Культура лёну даўгунца ў Беларусі».
6. **Г. Няміга** «Савецкая нацыянальная палітыка на прыкладзе гісторыі Беларусі ў асьвятленьні Н. Вакара.»
7. **А. Карповіч** «Кніга аб беларускім тэатры й драме».

Гэты другі нумар «Беларускага Зборніка» паангельску, падобна як і № 1, выдадзены вельмі старанна й густоўна вонкава афармлены, што навет і збоку формы можа сьмела канкураваць з навуковымі выданьнямі заходніх краінаў.

Падрабязную рэцэнзію аб гэтым выданьні надрукуем у вадным з наступных нумароў «Бацькаўшчыны».

У БЕЛАРУСКАЙ СЭКЦЫІ «ВЫЗВАЛЕНЬНЯ»

5 красавіка 1956 году, пасьля плённае двухгадовае працы, дасюлешні кіраўнік Беларускае Сэкцыі радыя «Вызваленьне» выехаў зь Мюнхэну назад у Канаду.

На разьвітаньне «Бацькаўшчына» шчыра зычыць яму й жонцы прыемнага падарожжа да новых «чужых берагоў», шчасьлівага жыцьця ды такое-ж плённае нацыянальна-вызвольнае працы ў будучыні.

Дык-жа шчасьці Вам Божа!..

Рэдакцыя «Бацькаўшчыны»

БАЗА ДАПАМАЕ ЭМІГРАВАЦЬ У ЗША

Гэтым падаецца да ведама, што кажны Беларус, хто хоча выэміграваць у Задзіночаныя Штаты Амэрыкі і патрабуе дапамогі ў выстаўленьні ашурансу (парукі аб матарыяльным забесьпячэньні, можа атрымаць яе ад Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, зьвяртаючыся на адрас: Byelorussian-American Ass'n, 33 Norfolk St., New York 2, N. Y., **USA.**

Галоўная Ўправа БАЗА

ПОШУКІ

Хто ведае аб месцы пражываньня сп. сп. Аўгена Чаўлытка і Янкі Пінчука, якія выехалі з Ангельшчыны да Канады ў канцы 1949 г., а таксама аб сп. Віктару Сініцкім, які выехаў зь Нямеччыны да Канады ў 1946—47 гг. (апошняга шукае сястра Юля), просіцца паведаміць на адрас:

Mr. W. Hucko
147 Mc Farlane St.,
Winnipeg 4, Man.,
Canada

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

АНГЕЛЬШЧЫНА:
Mr. Aleksander Laszuk, 97 Moore Park Rd, London, S. W. 6.

АРГЕНТЫНА:
Asociacion Bielorusa en la Argentina, Calle Coronel Sayos 2877, Valentin Alsina, p-cia Buenos Aires.

АЎСТРАЛІЯ:
Mr. A. Vasilenia, 39 Edwin St. Croydon, N. S. W.
Mr. A. Moroz, 109 Morrison Rd, Midland Junction, Western Australia.
Mr. M. Palashuk, 33 Chigford St. Fairfield-Melbourne, Vic.

БРАЗЫЛІЯ:
C. Cimafiejcyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba — Parana.

БЭЛЬГІЯ:
Mr. Vasil Sčećka, 19, Place Hoover, Louvain.

ЗАДЗІНОЧАНЫЯ ШТАТЫ:
Mr. L. Bielenis, 2042 W. St. Paul Ave, Chicago 47, Illinois.
Mr. B. Danilovich, 112 Somerset St. New Brunswick, N. J.
Mr. Ul. Duniec, 814 Brayton Ave. Cleveland 13, Ohio.

КАНАДА:
Mrs. N. Akula, 57 Riverdale Ave. Toronto, Ont.

НОВАЯ ЗЭЛЯНДЫЯ:
Mr. Marian Karanieuski, 88 Hercules Drayve, Roxburg — Hydro.

ФРАНЦЫЯ:
Mr. V. Mickievič, 47, Bd de Bezons Sartrouville (S. et O.).
Mr. Bonifacy Prytycki, 112, rue d'Alger, Roubais (Nord).

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.
Выдавец: Уладзімер Бортнік
РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ
Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды Рэдакцыі.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011